# Мары, сплеценыя з традыцый

**Мастацкая галерэя «Універсітэт культуры» запрашае на выставачны праект «Зямныя мары», дзе прадстаўлены работы беларускіх майстроў саломапляцення і выцінанкі. Творцы паспрабавалі адлюстраваць унутраную глыбіню і жыццёвыя інтарэсы простых людзей праз таямнічы і прывабны свет мар.**

Беларускае саломапляценне і выцінанка ўнесены ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА і з'яўляюцца гонарам і адметнай асаблівасцю нашай нацыянальнай культуры. Беларускія творы з саломкі не маюць аналагаў у свеце і з'яўляюцца адной з адметных форм выяўлення духоўных каштоўнасцей і мастацкіх традыцый беларусаў. Многія людзі, асабліва моладзь, лічаць гэтае мастацтва састарэлым і неактуальным. Аднак мастакі народных рамёстваў Мінска сваім прыкладам паказваюць, як можна інтэграваць нацыянальную спадчыну ў сучаснае жыццё.

Праз перапляценне тонкіх саломінак, праз ажурныя вобразы выцінанак творцы расказваюць пра мінулае і будучыню, пра абрады і вераванні нашых продкаў, прыродныя і жыццёвыя цыклы, пра любоў да бліжніх і шанаванне продкаў. Пачынаецца экспазіцыя з мастацтва выцінанкі, асноўнай тэмай якога стала цесная сувязь чалавека і прыроды, што ўзнікла вельмі даўно і цяпер працягвае ўплываць на нашу рэальнасць. Работы Вольгі Налівайка, Вікторыі Бародзіч і Валянціны Пазняковай адсылаюць да традыцыйнага мастацтва нашых продкаў. Тут можна ўбачыць дыяменты беларускай народнай творчасці — слуцкія паясы, ручнікі, дрэва продкаў, а таксама старажытныя таямнічыя рытуалы, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне.

Сучасная выцінанка адлюстроўвае падзеі і модныя тэндэнцыі апошніх дзён. Майстры Ніна Сакалова-Кубай, Вікторыя Бародзіч і іншыя прадставілі работы, якія добра падыходзяць пад любы інтэр'ер гарадской кватэры. Сюжэты самыя розныя: ад нацюрмортаў, анімалістыкі і міфалогіі да славутых мясцін Беларусі, абстрактных форм і сцэн паўсядзённага жыцця.

Мастацтва саломапляцення таксама займае не апошняе месца на выстаўцы. Марыя Бялова прадстаўляе



*Фрагмент экспазіцыі.*

творы, выкананыя ў традыцыйнай тэхніцы. Перад гледачамі паўстаюць беларуская батлейка з класічным сюжэтам Нараджэння Хрыстова, героі народных казак — конік залатагрывы, мядзведзь касалапы, козлік і інш. Валянціна Пазнякова, Галіна Удодава, Валянціна Курылёнак, Алена Таляронак, Аляксандра Кухціна і Жанэта Розум працуюць над інтэр'ернымі кампазіцыямі і элементамі гардэробу. Разнастайныя кветкі, вазы, шкатулкі для ўпрыгажэнняў, посуд, дэкаратыўныя падвескі, статуэткі, сумкі, капелюшы і вясельныя галаўныя ўборы — спроба майстроў інтэграваць спадчыну продкаў у сучасны інфармацыйны свет.

Асноўная задача выстаўкі — паказаць наведвальнікам, што традыцыі мінулага сёння могуць набыць новае прачытанне, захоўваючы аўтэнтычнасць і гармanічна ўплятаючыся ў сучасную культуру, робячыся крыніцай натхнення для творчасці і іншых форм самавыяўлення.

Праект арганізаваны Упраўленнем культуры Мінгарвыканкама, ДУ «Мінскканцэрт» у супрацоўніцтве з Беларускім саюзам майстроў народнай творчасці, пры падтрымцы кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Выстаўка працуе да 5 красавіка.

**Лізавета КРУПЯНЬКОВА,**
**фота аўтара**


**«Ураджайнае лета — з любімай газетай!»**

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» ці на газету «Літаратура і мастацтва» на II квартал або на I паўгоддзе 2025 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце яе і дасылайце да 24 красавіка 2025 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.



Сярод падпісчыкаў будуць разыграны два парнікі «Востраў камфорту» «Бабулін парнічок» і суперпрыз — цяпліца Green Apple GA-House-3x-frame Б0063899. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце да 2 мая 2025 года.

Прызы можна будзе атрымаць да 30 чэрвеня 2025 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» або «Літаратуру і мастацтва» на II квартал ці на I паўгоддзе 2025 года. Пасля 30 чэрвеня 2025 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ад падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні чытайце ў № 42 «Звязды» ад 1 сакавіка 2025 года.



Тэлефоны для даведак: (017) 271-12-94, 311-17-40.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» або «ЛіМа» на II квартал або на I паўгоддзе 2025 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________

____________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________

____________ на II квартал або на I паўгоддзе 2025 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) ______ (індэкс) ______ (аддзяленне сувязі)

____________

____________

Удачы ў розыгрышы!